**Чарняўская І.С. (Мінск)**

## Тэма Вялікай Айчыннай вайны ў сучаснай беларускай паэзіі

Другая Сусветная вайна стала сур’ёзным выпрабаваннем для ўсяго чалавецтва, і яе рэха не сціхае нават сёння, больш чым праз семдзясят год. У час ліхалецця, калі наша краіна губляла кожнага трэцяга беларуса, у нацыянальнай літаратуры ваенная тэма загучала асабліва моцна, гучна і пранізліва. Цэлы шэраг аўтараў-сведак тых страшных падзей (М. Аўрамчык, П. Броўка, П. Глебка, А. Куляшоў, Я. Колас, Я. Купала, П. Панчанка, М. Сурначоў, М. Танк і многія іншыя) паслядоўна адлюстроўвалі ў вершах трывогу ад усведамлення страшнай навіны, жудасць крывавых баёў, складанасць жыцця ў тыле.

Праз паўстагоддзя мірнага жыцця тэма Вялікай Айчыннай вайны “не адпусціла” беларускіх аўтараў, але ўжо досыць многа страціла, прынамсі, у колькасным плане. Жыццё давала новыя нагоды для радасці і смутку, а адпаведна і новыя тэмы для пісьменніцкага пяра. У 1990-я і 2000-я гг. асабліва востра паўстала экалагічная тэма, тэма міру паміж светам чалавека і прыроды; многія аўтары на мяжы тысячагоддзяў схіліліся ў бок філасафічнасці, псіхалагізму, заглыбленасці ў духоўны свет; у маладога пакалення актыўна выяўлялася цікавасць да новых плыняў, якія патрабавалі абнаўлення не толькі формы, але і тэматыкі. Да таго ж з кожным годам заставалася ўсё менш і менш жывых сведкаў падзей 1941–1945 гг. Усё гэта ў пэўнай ступені спрыяла таму, што ўспаміны сталі паступова сцірацца не толькі з памяці, але і са старонак вершаваных зборнікаў: усё радзей ваенная тэма станавілася магістральнай у творчасці пісьменнікаў, часцей яе маркерам былі рэдкія нізкі або нешматлікія асобныя вершы (М. Башлакоў, Н. Гілевіч, А. Звонак, П. Прыходзька, М. Шабовіч, В. Шніп). Да таго ж часта такія прыклады ў большай ступені датычыліся творчасці аўтараў пакалення “дзяцей вайны”.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

Галасамі паэтаў мірнай генерацыі хоць і куды радзей, але таксама гучалі словы пра ўжо далёкую для іх вайну. Своеасаблівым тлумачэннем абыходжання ваеннай тэмы падаецца верш Анатоля Сыса “Я думаў, пра вайну пісаць не маю права…”. “Я думаў, пра вайну пісаць не маю права – / мой белы конь не пасвіўся на мінным полі, / Мой белы верш не захлынаўся барвай – / я думаў, пра вайну не напішу ніколі. / Ды выспеў дзень, калі асколкі кулі / скрозь сэрцы дрэў маё дасталі сэрца, / скрозь душы дрэў маю душу кранулі, / нібы па мне прайшла / мяжа жыцця і смерці” [5, с. 310], – прызнаецца лірычны герой яго верша і тым самым выдае і сваю памяць пра вайну, і павагу да тых, хто здабываў перамогу, і ледзь улоўнае адчуванне віны. Падобную танальнасць, але іншую сюжэтна-кампазіцыйную будову

мае верш “Песня пра сына”. Ён складаецца з дзвюх частак. У першай лірычны герой скардзіцца на лёс і смуткуе з прычыны таго, што “сын загінуў на вайне <…>, / ён згінуў па маёй віне. / Я ж ваяваць не ўмею – / адправіў сына за сябе…” [5, с. 287], сам жа з той пары жыве ў людскіх праклёнах. Героем валодае не толькі пачуццё ўласнай віны, здзеклівай несправядлівасці лёсу (“Каму мой хлеб патрэбны?”) і смутку, але і трывожнага прадчування новай навалы: “бо, кажуць, будзе зноў вайна, / таму сыны навошта, / маўляў, у Сціксе сатана / даўно сцягі палошча” [5, с. 288]. Другая кампазіцыйная частка адкрывае сапраўднага лірычнага героя і, падаецца, гучыць голасам самога аўтара: “Мой сын не згінуў на вайне, / шчаслівы той, хто шчыры: / хай Беларусь вайна міне. / За вас! / За сына! / З мірам!” [5, с. 288]. Аповед вядзецца ад першай асобы, але наіўна-простая мова “лірычнага героя” першай часткі верша, спавядальна-даверлівая інтанацыя, ускоснае апісанне ваенных наступстваў не раздражняюць псеўдарэалістычнасцю і наіграным пафасам ўяўнага героя з далёкіх 40-х. А другая частка канчаткова пераконвае ў тым, з якой паважлівай асцярожнасцю аўтар ставіцца да памяці пра вайну, усведамляе маштабы яе магчымых будучых наступстваў і заклікае берагчы мір. Яшчэ адна згадка пра вайну ў лірычнай спадчыне А. Сыса – верш “Дзікі мёд”, лірычны герой якога ўспамінае, як “у вайну ў партызанскі год / пад крысом шыняля армейскага / бацька з лесу прынёс дзікі мёд <…>” [5, с. 253]. І хоць у названых вершах тэма вайны выяўляецца “фізічна” (міннае поле, асколкі, кулямёт, армейскі шынель і г.д.), але такая “рэчавая” яе прысутнасць досыць умоўная: атрыбуты ваеннай пары ў лірычных радках А. Сыса – гэта не імкненне аўтара да частковай рэканструкцыі тагачаснай рэчаіснасці, а своеасаблівыя “маркеры памяці” пра вайну, шчырае і асцярожнае прызнанне ў гэтай памяці: “Адкапаю пайду кулямёт, каб хадзіць смела ў бацькавы пушчы” [5, с. 253].

Мадэрнісцкія плыні, якія ўключыліся і ў беларускі літаратурны працэс, вымагалі ад іх прыхільнікаў-творцаў наватарскага погляду на паэзію і, адпаведна, арыгінальнага яго выяўлення ў вершах. Прыкладам такой “даніны” літаратурнай модзе стаў цыкл вершаў Усевалада Гарачкі, надрукаваны ў БУМ-БАМ-ЛІТаўскім “Тазіку беларускім” (1998) пад назвай “Пасля вайны”, пра прыгоды аднаногага дзеда, які страціў нагу “на Вялікай, на Айчыннай <…> у Берліне ля Рэйхстага” [6, с. 73], а таксама яго цыклы “Свята вайны”, “Дзедава нага” і асобныя вершы той жа тэматыкі са зборніка “Багі і героі” (2009). Тэма Вялікай Айчыннай вайны, якая дагэтуль мела нефармальны статус “свяшчэннай” і прадугледжвала выключную павагу і піетэт аўтараў, якія звярталі на яе сваю пісьменніцкую ўвагу, была “скампраметавана” іранічнымі намёкамі, адметнай, нетыповай для абранай

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

тэмы метафарычнасцю, чорным гумарам і да т.п.: “Недзе п’е за перамогу здраднік-дзед, / А Нага – Нага пайшла ў белы сьвет. / Холад дзікі: на двары сабака здох, / А Нагу ніхто ня пусьціць на парог, / Дзед забыўся пра яе і вынес бот, / А ў вайну Нага закрыла целам дот. / Ды ад праўды ад зямной ніхто ня зьбег, / Пад сабачы закапаюць дзеда брэх. / А Нага, яна між намі назаўжды, / Яе імем называюць гарады” [1, с. 27]. Вобразы аднаногага дзеда-апавядальніка, самой Нагі (напісанне з вялікай літары як уласнага назоўніка – аўтарскае, У. Гарачкі), удзельнікаў вайны пераходзяць з верша ў верш, з кнігі ў кнігу, нават без аб’яднання пад назвай аднаго цыкла ці зборніка: “А з вялікай, а з Айчыннай – / Дзед вярнуўся не мужчынам. / Да таго ж, – і без Нагі…” – з цыклу “Пасля вайны” [1, с. 73]; “Зноў май / Варыць сваю страву: / Кіпіць ветэранамі плошча, / Вецер ім / Языкі палошча, / Сцягі / Злева і справа” – з цыклу “Свята вайны” [1, с. 13]; “дзед ішоў, каб падарваць / Эшалон… / Сам уцёк, але Нага – / Пад адхон. / Ўзялі дзедаву Нагу / У палон, / Катавалі, / Але марным быў / Плён” [1, с. 24]. У гэтай сувязі згадваецца верш Васіля Зуёнка “У прымыльніку – мыліцы і пратэз” (1965), герой якога таксама страціў нагу на вайне. “Нага са скрыпам хромавым”, якую “Не пусціў гаспадар, / без яе палез / На палок дубовы, стогромавы” [2, с. 35–36], – жудасны напамін пра вайну, на які нельга забыцца не толькі фізічна, але і маральна, да якога нельга звыкнуцца і праз дваццаць гадоў. Вобраз былога салдата, створаны пісьменніцкім талентам В. Зуёнка без штучнага пафасу і “ваеннага антуражу”, у адрозненне ад вобразаў лірычнага героя вершаў У. Гарачкі, кранае трагічнай шчырасцю і выклікае не проста спачуванне, а павагу і ўдзячнасць да ўдзельнікаў вайны.

Бадай, часцей за астатніх беларускіх паэтаў да гэтага часу ваенная тэма хвалюе Міколу Мятліцкага. Яго кнігі 2000-х гг. паслядоўна змяшчаюць досыць прадстаўнічую колькасць вершаў на ваенную тэму. Паэтычны голас М. Мятліцкага – гучны і пазнавальны на літаратурнай трыбуне. Вершы пісьменніка, публіцыстычныя па гучанні, здаецца, і не маглі абысці такое глабальнае пытанне. Дарэчы, ваенныя творы М. Мятліцкага пры пэўнай ступені ўмоўнасці ўсё ж можна падзяліць на вершы, прысвечаныя тэме ўласна Вялікай Айчыннай вайны, і вершы на тэму міру. Пры ўсёй знешняй аднабаковасці тэматычнага падзелу, яны ўсё ж маюць розную аснову. Сучасную ваенную лірыку Беларусі ўзбагацілі такія вершы М. Мятліцкага, як “Перамога”, “Стары акоп”, “22 чэрвеня 2001 года” і інш. Аднак куды большая колькасць вершаў паэта, прысвечаных глабальнаму пытанню міру на зямлі ў цэлым і ў Беларусі ў прыватнасці (“Зарабляюць на зброі…”, “І гэты дзень, нічым не значны…”, “Злачынны свет – звадкі і войны…”, “Зачаста сейбічам вайны…”, “Сякеру ў рукі бяруць”, “Было ўжо на Русі –

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

хадзілі брат на брата…”, “Быліна пра чалавечае паляванне” і інш.). Гэта не лірыка памяці і жалобы, а палымяныя заклікі да захавання міру праз памяць пра знішчальныя войны. Аўтар разважае над самой прыродай вайны “Колькі іх, крывавых рэк / У вяках цячэ? – не дзіва. / Бо ўхмыльнуўся люта, крыва / Чалавеку чалавек” [3, с. 22], разумее іх непазбежнасць (“І цень злавечае вайны / За кожным з нас ступае ўслед” [3, с. 11]) і пры гэтым усё ж заклікае да міру і шчыра спадзяецца на яго (“Мір кожнай хаце тваёй, Мір. / Сонца ў нябёсах вечна прабудзе” [3, с. 14]. У “Быліне пра чалавечае паляванне” М. Мятліцкі прасочвае “ваенную эвалюцыю” чалавека, якая з кожным новым дасягненнем прыводзіць да ўсё больш страшных і незваротных наступстваў, задаецца пытаннем, як “Сёння ў нязвыклай людской цяснечы / Утаймаваць свой гнеў чалавечы” [3, с. 19]. Лірычны герой вершаў М. Мятліцкага не застаецца сам насам са сваімі трывогамі, а дзеліцца імі з чытачом і заклікае яго разам знайсці адказ, каб захаваць мір.

На старонках перыядычных выданняў пачатку новага стагоддзя таксама не асабліва часта з’яўляюцца вершы ваеннай тэматыкі. Найбольш поўна гэта тэма адлюстравана ў часопісе “Полымя”, у якім пэўны час была адмысловая рубрыка “Вечны агонь Перамогі”. Час ад часу лірыка пра вайну з’яўляецца на старонках газет “Літаратура і мастацтва”, “Наша ніва”, часопіса “Маладосць” і інш. Аднак на сённяшні дзень беларускамоўная перыёдыка калі і друкуе вершы пра Вялікую Айчынную вайну, то звычайна прымяркоўвае публікацыі да адпаведных святочных дат, часта змяшчаючы, акрамя таго, ужо вядомыя, раней апублікаваныя творы папярэдніх гадоў і дзесяцігоддзяў. Так, напрыклад, ва ўжо ўзгаданым часопісе “Полымя” (№ 5, 2003) змешчаны вершы ваеннай тэматыкі П. Панчанкі (1945), А. Пысіна (1977), М. Танка (1966), падборка вершаў П. Пранузы, датаваная 1942–1945 гг. (№ 5, 2005) і г.д. Разам з тым зрэдку сучасныя аўтары друкуюць паэтычныя нізкі ці асобныя вершы, так ці інакш звязаныя з тэмай Вялікай Айчыннай вайны. Навізной формы, кампазіцыі, вобразнасці, нечаканымі сюжэтнымі знаходкамі такія публікацыі, як правіла, не вызначаюцца. Часцей гэта альбо ўспаміны пра вайну, якую давялося перажыць асабіста (П. Пралуза (“9 Мая”, “Са мной на фронце быў Купала”, “Мы ў сяло ўступілі”), П. Прыходзька (“З аднаго поля бою”, “Працяг балады”, “Ля сцен Рэйхстага”, “Вяртанне з вайны” ), А. Нафрановіч (дыптых “Дарога ў апраметную”, “Партызанскі гармонік”) і інш.; ці прысвячэнні ветэранам, блізкім, загінуўшым на вайне (І. Муравейка (“Ветэраны”), Я. Каршукоў (“Ветэранам вайны”), В. Максімовіч (“Балада памяці”)) і г.д.

Такім чынам, тэма Вялікай Айчыннай вайны, якая доўгі час захоўвала папулярнасць у беларускіх аўтараў, на мяжы тысячагоддзяў саступіла пазіцыі

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

іншым, больш актуальным праблемам, і ў пэўнай ступені ўмоўна раздзяліла корпус мастацкіх тэкстаў на вершы-ўспаміны пра вайну (пісьменнікі ваеннага пакалення, “дзеці вайны”) і вершы-памяць пра вайну (паэты мірнага часу). Аднак нават у самым шырокім разуменні лірыка ваеннай тэматыкі сустракаецца ў творчасці пісьменнікаў усё радзей, і ў большасці сваёй “расцярушана” па перыядычных выданнях, публікацыі ў якіх прымяркоўваюцца да пэўных дат, звязаных з Вялікай Айчыннай вайной.

Літаратура

1. Гарачка, У. Багі і героі / У. Гарачка. – Мінск : Галіяфы, 2009. – 71 с.

2. Зуёнак, В. Выбраныя творы / В. Зуёнак. – Мінск : Бел. кнігазбор, 2010. – 512 с.

3. Мятліцкі, М. Замкнёны дом / М. Мятліцкі. – Мінск : Маст. літ., 2005. – 315 с.

4. Мятліцкі, М. На беразе маім / М. Мятліцкі. – Мінск : Маст. літ., 2010. – 293 с.

5. Сыс, А. Лён : выбраныя творы / А. Сыс. – Мінск : Кнігазбор, 2006. – 436 с.

6. Тазік беларускі. – Мінск : ЗАА “Верыта”, 1998. – 94 с.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ